УДК 811.161.3’367.3

# Трансфармацыя тэксту ў сучаснай адукацыйнай прасторы

**Васюковіч Л.С.**
*Віцебскі філіял установы адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі “Міжнародны ўніверсітэт «МІТСО»”, Віцебск*

*Праблема вызначэння ролі тэксту ў гуманітарнай сферы, у адукацыйным асяроддзі не толькі не вычарпала сябе, яна па-ранейшаму не страчвае актуальнасці. Айчынныя і замежныя вучоныя прызнаюць у тэксце метадалагічны і метадычны цэнтр кніжнай культуры.*

*Мэта даследавання – тэарэтычна асэнсаваць і выявіць характар трансфармацый тэксту ў рэчышчы сучаснага адукацыйнага асяроддзя.*

***Матэрыял і метады.** Матэрыялам паслужыла тэкстатэка школьных падручнікаў па беларускай мове (9–11 класы) для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. У працэсе аналізу выкарыстаны наступны комплекс метадаў: тэарэтычны, эмпірычны, статыстычны.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.** Праца з тэкстам у рэчышчы трансфармацыі адукацыйнай прасторы праектуе прымяненне інтэграванай методыкі, кампанентамі якой выступаюць: інтэлектуалізацыя кантэнту; візуалізацыя тэкстаў за кошт рознафарматнай інфармацыі; павышэнне лексікаграфічнай культуры; фарміраванне ўменняў праектнай дзейнасці, назапашванне вопыту даследчай працы.*

***Заключэнне.** Трансфармацыя адукацыйных рэсурсаў спараджае праблему гарманізацыі традыцыйнай і інавацыйнай тэкставай дзейнасці. Інтэграваная методыка працы з тэкстам арыентавана на назапашванне інтэлектуальна-маўленчага вопыту навучэнцаў, выкарыстанне сфарміраваных кампетэнцый для вырашэння пазнавальных і жыццёвых задач.*

***Ключавыя словы:** тэкст, трансфармацыя тэксту, тэксты новай прыроды, інтэграваная методыка працы.*

*(Ученые записки. – 2023. – Том 38. – С. 151–154)*

# Transformation of the Text in the Modern Educational Space

**Vasiukovich L.S.**
*Vitebsk Branch of the Educational Institution of the Federation of Trade Unions of Belarus “International University MITSO”, Vitebsk*

*The problem of identifying the role of the text in the humanitarian sphere, in the educational space, has not exhausted itself, it, on the contrary, as before, does not lose its relevance. Domestic and foreign scholars recognize the text as the methodological center of book culture.*

*The purpose of the study is to theoretically substantiate and identify the nature of text transformations in the modern educational space.*

***Material and methods.** The material was a text library of school textbooks in Belarusian (grades 9–11) for general secondary education institutions. A complex of methods was used in the analysis process – theoretical, empirical, statistical.*

***Findings and their discussion.** Working with text in the conditions of transformation of the educational space projects the use of an integrated methodology, the components of which are: intellectualization of the content; visualization of texts using multi-format information; increasing lexicographic culture; developing skills in project activities; gaining experience in educational and research work.*

***Conclusion.** The transformation of educational resources gives rise to the problem of harmonizing traditional and innovative textual activities. The integrated methodology of work is focused on enriching the intellectual and speech experience of students, using the developed competencies to solve cognitive and life problems.*

***Key words:** text, text transformation, texts of a new nature, integrated work methodology.*

*(Scientific notes. – 2023. – Vol. 38. – P. 151–154)*

*Адрас для карэспандэнцыі:* ***e-mail: vasuk.mila@tut.by*** *– Л.С. Васюковіч*

Павышэнне статусу ведаў, інфармацыйных тэхналогій праецырue новы этап развіцця сучаснай адукацыі. Сённяшняя адукацыйная прастора адлюстроўвае мадыфікацыі, выкліканыя ўздзеяннем сацыякультурных фактараў: інфарматызацыя грамадства, інтэнсіўнасць лічбава-камунікатыўных тэхналогій, перабудова кагнітыўнай сферы маладых людзей. Для сучаснай сістэмы адукацыі характэрныя наступныя тэндэнцыі:

– разуменне зместу адукацыі не як сукупнасці прадметных ведаў, а як сістэмы культуры – інфармацыйнай, працэдурнай, рэфлексійнай;

– запатрабаванасць у тэхналогіях, арыентаваных на задавальненне асабістых запытаў, на самасцвярджэнне, у старшых класах – на ажыццяўленне праектна-даследчай дзейнасці, выбар прафесійнага шляху;

– павышэнне ўдзельнай вагі рэфлексійных ведаў, скіраваных на спазнанне ўласнага патэнцыялу, развіццё асобаснай матывацыі.

Мэта артыкула – тэарэтычна асэнсаваць і выявіць характар трансфармацый тэксту ў рэчышчы сучаснага адукацыйнага асяроддзя.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам паслужыла тэкстатэка школьных падручнікаў па беларускай мове (9–11 класы) для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у працэсе аналізу выкарыстаны комплекс метадаў – тэарэтычных, эмпірычных, статыстычных.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Віртуальныя зносіны, новыя спосабы навучання і камунікацыі адлюстроўваюць варыянты кантактавання з дапамогай медыйных сродкаў: адукацыйныя парталы, шматлікія педагагічныя форумы, блогі, матэрыялы, прадстаўленыя інтэрнэт-сервісам YouTube. Як вядома, традыцыйныя формы зносін – пісьмовая і вусная – знаходзяцца ў адносінах актыўнага ўзаемаўплыву. Сучасная сітуацыя парушае гэтую камунікатыўную гармонію. Камунікатыўны дысбаланс выклікаецца тым, што, з аднаго боку, віртуальныя формы зносін маюць вялікі патэнцыял для самаадукацыі, узбагачэння інтэлектуальных магчымасцей. З другога боку, скарачэнне часу на рэальныя кантакты прыводзіць да фармальнага і фрагментарнага “жывога” ўзаемадзеяння, якое набывае паверхневы, няўстойлівы характар.

Псіхолагі адзначаюць, што развіваецца тэндэнцыя да зніжэння ўзроўню сацыяльнай адаптацыі падлеткаў, што тлумачыцца павелічэннем удзельнай вагі не рэальнай, а віртуальнай камунікацыі. Маладыя людзі характарызуюцца больш высокай ступенню эмацыянальнай нестабільнасці і інфантыльнасці. Фарміруецца такая негатыўная тэндэнцыя, як павелічэнне дыстанцыі паміж суб’ектамі адукацыйнага працэсу, зніжэнне значнасці зносін паміж настаўнікамі і вучнямі, рост трывогі, напружанасці ў адносінах. У сучасных умовах актуалізуецца роля эмацыянальна-каштоўнаснага кампанента адукацыі. Даследчыкі сцвярджаюць: “Сапраўдная мэта агульнай адукацыі павінна вызначацца адным, але дастаткова ёмістым словам – адухоўленасць. Адухоўленасць чалавека як асэнсаванне ім свайго адзінства з гэтым цудоўным і дзіўным светам, а гэта не магчыма без шчырай зацікаўленасці да разумення яго ўнутранай сутнасці, без сфарміраванага пачуцця адказнасці за яго” [1, с. 162].

У кантэсце зменаў у соцыуме, інтэнсіўнага развіцця тэхналогій і сацыяльных сетак сфарміравалася новае пакаленне, якое нарадзілася або вырасла ў новым – інфармацыйным – грамадстве. Зразумела, што сучасная методыка павінна ўлічваць псіхалінгвістычныя асаблівасці сённяшніх падлеткаў, спецыфіку пазнавальнай сферы прадстаўнікоў пакалення Z. Сярод найменняў прадстаўнікоў новай генерацыі фігуруюць шматлікія назвы: лічбавае пакаленне, лічбавыя абарыгены, лічбавыя з нараджэння, лічбавікі і інш. Аб’яднальным момантам усіх назваў з’яўляецца станаўленне пакалення ва ўмовах лічбавай рэвалюцыі, новых інфармацыйных тэхналогій, развіццё грамадства ў так званы постіндустрыяльны перыяд. Сярод характарыстык пакалення Z даследчыкі (А.А. Вярбіцкі, О.В. Дружба, Т.В. Конюхава, Дж.М. Твендж, О.В. Яршова і інш.) вылучаюць:

– ранняе авалоданне лічбавымі тэхналогіямі;

– шматвектарнасць, паралельнае вырашэнне некалькіх задач;

– дамінаванне візуальнай інфармацыі, прыярытэт невербальных тэкстаў;

– развіццё кліпавага мыслення;

– запамінанне алгарытмаў атрымання інфармацыі, а не самой інфармацыі (эфект Google);

– цяжкасці з успрыманнем складанага/аб’ёмнага тэксту.

Як зазначаюць даследчыкі, сучаснае пакаленне здольна адначасова вырашаць некалькі задач, паралельна знаходзіцца на некалькіх сайтах, аднак, як правіла, не прыстасавана да выканання лінейных заданняў, адсутнічае навык канцэнтраваць увагу. Што да мультызадачнасці, то яе ацэнка знаходзіцца ў дыялектычнай плоскасці – як станоўчай, так і негатыўнай. Доктар псіхалагічных навук Джын М. Твендж пераканaны: мультызадачнасць суправаджаецца непазбежнай праблемай, паколькі “чалавечы мозг не можа выконваць больш за адну задачу ў кожны дадзены момант. Калі вы спрабуеце займацца дзвюма справамі адначасова, вам прыходзіцца пераключаць сваю ўвагу. Гэта патрабуе намаганняў і не з’яўляецца эфектыўным спосабам… Рэальная мультызадачнасць не пад сілу ніводнаму чалавеку” [2, с. 26].

Адна з асаблівасцей прадстаўнікоў лічбавага пакалення, як падкрэсліваюць вучоныя, – сфарміраванасць кліпавага мыслення. Даследчыкі з дыяметральных пазіцый ацэньваюць кліпавае мысленне як здольнасць чалавека ўспрымаць сусвет праз яркія карцінкі, сціслыя фрагменты ў фармаце відэакліпа або тэлевізійных навін. Да пазітыўных аспектаў такога мыслення адносяць: гэта свайго роду абарона, засцярога ад залішняй інфармацыі, сродак пазбаўлення ад інфармацыйнай перагрузкі. Што да адмоўных прымет кліпавага мыслення, то яны праяўляюцца

ў няўстойлівай здольнасці выбудоўваць лагічныя, прычынна-выніковыя ланцужкі, у адсутнасці ўмення аналізу, сінтэзу, супастаўлення, абагульнення інфармацыі, у няўменні асэнсаваць іерархію задач, вылучыць падзадачы як этапы дасягнення вынікаў. З улікам спецыфікі кліпавага мыслення сённяшніх навучэнцаў, сфарміраванага пад уплывам візуальнага фармату прадстаўлення матэрыялу, варта адэкватна асэнсоўваць асаблівасці іх успрымання, запамінання і ацэньвання інфармацыі. Вучоныя выказваюць трывогу, што "дзеці, якія не ўмеюць чытаць і аналізаваць лінейныя тэксты як паслядоўнасць слоў, сказаў, дум, не развіваюцца інтэлектуальна" [3, с. 12].

Веданне спецыфікі "лічбавых" дзяцей дапамагае знаходзіць рацыянальныя метадычныя рашэнні. Прызнанне феномена кліпавага мыслення сведчыць пра пераход ад лінейнай мадэлі мыслення да новай, сеткавай. Заканамерна ўзнікае пытанне: "Што рабіць настаўнікам у сучасных умовах?" Н.А. Барысенка фармулюе рытарычны адказ наступным чынам: "Ісці ўслед за развіццём новых форм мыслення (праз выкарыстанне дробных яркіх слайдаў на прэзентацыях, паказ відэаролікаў, фрагментацыю матэрыялу і т.п.) або супрацьстаяць ім, паніжаць рызыку іх узнікнення" [4, с. 11].

Нягледзячы на педагагічныя навацыі, вядучым паняццем метадычнай навукі застаецца *тэкст* у абноўленым, адпаведным часу фармаце. Праблема вызначэння ролі тэксту ў адукацыйным асяроддзі, характару працы з ім не толькі не вычарпала сябе, але па-ранейшаму захоўвае актуальнасць. У залежнасці ад прадмета даследавання паняцце тэксту трактуецца ў розных аспектах. М.М. Бахцін трактаваў тэкст як "звязаны знакавы комплекс", як першааснову гуманітарных дысцыплін. Вучоны сцвярджаў: "Тэкст з'яўляецца той непасрэднай рэальнасцю (рэальнасцю думак і перажыванняў), з якой толькі і могуць нараджацца гэтыя дысцыпліны і гэтае мысленне. Дзе няма тэксту, там няма і аб'екта для даследавання і мыслення" [5, с. 297].

У разнастайнасці дэфініцый тэксту выразна бачыцца сістэма каардынат, у якой асэнсоўваецца сутнасць паняцця: камуніканты (суб'екты адукацыйнага працэсу), адлюстраваная рэчаіснасць (рэальная або віртуальная), кантэкст, паралелі з іншымі тэкстамі. Мноства азначэнняў тэксту сведчыць пра шматмерную культурную, інфармацыйна-каштоўнасную прастору, у якой існуе гэтае паняцце. Айчынныя і замежныя вучоныя прызнаюць у тэксце метадалагічны і метадычны цэнтр кніжнай культуры, ключавы сродак навучання, паколькі менавіта на ўзроўні тэксту раскрываецца камунікатыўная сутнасць мовы. Праз тэкст як сродак стварэння развіццёвага асяроддзя адбываецца спазнанне моўных з'яў, граматычных катэгорый, фарміруецца сістэма лінгвістычных паняццяў, забяспечваецца фарміраванне маральна-каштоўнасных якасцей, адбываецца станаўленне асобасных адукацыйных вынікаў (Г.М. Валочка, А.Д. Дзейкіна, В.У. Зелянко, А.П. Ерамеева, Н.А. Іпалітава, В.А. Маслава, Н.Л. Мішаціна, Т.М. Пахнова, В.Ф. Русецкі, Л.А. Хадзякова, М.Г. Яленскі).

Практыка абнаўлення адукацыйных рэалій найперш звязана з новымі фарматамі тэкстаў, што прымяняюцца для фарміравання сацыяльна-камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнцаў. Так, сучасныя кантрольна-вымяральныя матэрыялы ўключаюць не толькі тэксты сферы мастацтва, афіцыйна-дзелавых і бытавых зносін. Паўсядзённыя зносіны рэпрэзентуюць securityнафарматныя тэксты: шыльды-назвы, рэжым працы магазінаў, кафэ, пошты, паліклінік, кінатэатраў, розных афіцыйных устаноў, паказальнікі геаграфічных назваў, імён, інфармацыйных крыніц, інфармацыйныя табло, таблічкі з назвамі вуліц, плошчаў, знакі, што дазваляюць/забараняюць пэўныя дзеяннні, рэкламныя аб'явы і іншыя.

Пад *тэкстамі новай прыроды* разумеюцца фрагменты, якія здольныя ўтвараць "шырокую групу тэкставых структур, адрозных ад традыцыйных… Пад тэкстам новай прыроды маецца на ўвазе думка, зафіксаваная на любым носьбіце, для перадачы якой выкарыстоўваецца паслядоўнасць разнародных сімвалаў, знакаў вербальнага і невербальнага паходжання" [6, с. 9]. "Новыя" тэксты ўяўляюць сабой сінтэз мультымедыйных і вербальных кампанентаў, актыўна выкарыстоўваюць інфаграфіку, дапоўненую рэальнасць і іншыя магчымасці камунікацыі. Зварот да тэкстаў новай прыроды ў адукацыйным асяроддзі выклікаў да бытавання мультытэксты, народжаныя асаблівасцямі сучаснай кагнітыўнай сферы.

Развіццё тэкстаў новай прыроды – спроба адшукаць альтэрнатыву славеснаму навучанню. Розныя сацыякультурныя коды даюць падставу спадзявацца на паўнацэнную гарманізацыю лагічна-структураванай і вобразнай інфармацыі. Шматфарматнасць інфармацыі не гарантуе стопрацэнтнага поспеху, аднак дае надзею на пераадоленне негатыўных наступстваў кліпавага мыслення на характар пазнавальнай дзейнасці. Гэтая акалічнасць мае істотнае значэнне, паколькі сённяшні ўзровень светапогляду маладых людзей, іх сістэма каштоўнасцей будзе вызначаць заўтрашні дзень грамадства. Педагагічная грамадскасць вядзе настойлівыя пошукі кампрамісу паміж цэласным успрыманнем кніжнай і электроннай культуры, сінтэзам сістэмнага, лагічнага і кліпавага, "сканіраванага" мыслення.

Новыя магчымасці лічбавай рэальнасці маюць і пазітыўны патэнцыял: разнастайнасць крыніц новай інфармацыі, самавыяўленне праз уласную творчасць, фарміраванне асобаснай пазіцыі. Адпаведна ўзнікае неабходнасць планаваць адукацыйны працэс з улікам трансфармацыі грамадства пад уплывам новых тэхналогій. Тэксты новай прыроды арганічна інтэгрыруюць слова, гук, анімацыю, карцінку, патрабуюць назапашвання вопыту працы з мультымадальнымі фарматамі. Зразумела, што лічбавая рэальнасць як сфера дзейнасці і зносін становіцца для сучаснага

дзіцяці адным з ключавых фактараў пасляховай сацыялізацыі. Ігнараванне гэтага факта можа паглыбіць разрыў паміж асаблівасцямі лічбавага пакалення і сучаснай школы. Прызнанне гэтага факта канцэнтруе ўвагу педагагічных даследаванняў на пошуку адэкватных трансфармацый і рашэнняў аб зменах у методыках навучання і выхавання сучаснай моладзі.

На думку псіхолагаў, актыўнае бытаванне ў інтэрнэт-прасторы фарміруе неабходнасць успрымаць інфармацыю невялікімі порцыямі, яна павінна быць прадстаўлена сцісла, наглядна, суправаджацца невербальным фарматам. Альтэрнатывай інтэрнэтзалежных паводзін можа быць толькі школа з яе класічнай задачай – фарміраванне паняційнага мыслення, цэласнага ўспрымання з'яў, устанаўленне лагічных, прычынна-выніковых сувязей паміж імі. У метадычным арсенале сучаснага настаўніка павінны знаходзіцца "не модныя", класічныя прыёмы класіфікацыі і параўнання фактаў, вылучэння галоўнай і другаснай інфармацыі, яе крытычны, шматаспектны аналіз – з мэтай фарміравання свайго меркавання, уласнай пазіцыі, крытычнай ацэнкі фактаў, падзей, з'яў.

У каардынатах абнаўлення пазнавальнай дзейнасці запатрабаванымі застаюцца ўменні працы з інфармацыяй, вопыт паўнацэннага дыялогу з тэкстам. Тэксты ва ўмовах трансфармацыі адукацыйнага асяроддзя патрабуюць *інтэграванай методыкі працы,* паколькі на сённяшні дзень "без інтэгратыўнага падыходу немагчыма даследаваць складаныя феномены, да якіх адносяцца мова, культура, свядомасць. Ён становіцца найважнейшым светапоглядным накірункам усёй навукі XXI стагоддзя" [7, с. 828].

**Заключэнне.** Трансфармацыя адукацыйных рэсурсаў спараджае праблему гарманізацыі традыцыйнай і інавацыйнай тэкставай дзейнасці. Інтэграваная методыка працы з тэкстам арыентавана на назапашванне інтэлектуальна-маўленчага вопыту навучэнцаў, выкарыстанне сфарміраваных кампетэнцый для вырашэння пазнавальных і жыццёвых задач. Спосабамі выяўлення лінгваметадычнага патэнцыялу тэкстаў новай прыроды выступаюць: інтэлектуалізацыя адукацыйнага кантэнту (суправаджэнне гіперспасылкамі); візуалізацыя вучэбных тэкстаў за кошт рознафарматнай інфармацыі; павышэнне лексікаграфічнай культуры працы з электроннымі слоўнікамі; фарміраванне ўменняў праектнай дзейнасці, назапашванне вопыту вучэбна-даследчай працы.

## Літаратура


1. Васильев, И.А. Эмоции и мышление: монография / И.А. Васильев, В.Л. Поплужный, О.К. Тихомиров. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1990. – 194 с.
2. Твендж, Джин М. Поколение селфи: науч.-попул. издание / Джин М. Твендж. – М.: Эксмо, 2018. – 328 с.
3. Холодная, М.А. Интеллектуальность, креативность, обучаемость: ресурсный подход (о развитии идей В.Н. Дружинина) / М.А. Холодная // Психол. журн. – 2015. – № 5. – С. 5–14.
4. Борисенко, Н.А. Что нужно знать учителю-словеснику о психологических особенностях поколения Z / Н.А. Борисенко // Русский язык в школе. – 2021. – № 3. – С. 7–17.
5. Бахтин, М.М. Эстетика словесного творчества / М.М. Бахтин. – М.: Искусство, 1986. – 444 с.
6. Казакова, Е.И. Тексты новой природы: закономерности и технологии развития современной грамотности в условиях качественной модернизации современного текста / Е.И. Казакова // На путях к новой школе. – 2014. – № 1. – С. 4–12.
7. Маслова, В.А. Через синергетический союз лингвистики с другими науками – к новым проблемам и направлениям / В.А. Маслова // Вестн. РУДН. Сер.: Теория языка. Семиотика. Семантика. – 2021. – Т. 12, № 3. – С. 823–847.


*Паступіў у рэдакцыю 13.11.2023*